■ Напярэдадні

# «...БО ДЗВЕРЫ Ў ПЕКЛА НА ГЭТЫ ЧАС ЗАЧЫНЯЮЦЦА»

**Вялікдзень — самае вялікае, самае адметнае з усіх праваслаўных свят, да яго рыхтуюцца загадзя. А весь як? Шмат чаго мне расказалі бацькі, шмат — старажылы вёскі.**

Многія павер'і звязаны з чыстым чацвяргом, у які, да вечара, трэба было вымыць і вычысціць дом, прыбраць яго галінкамі вярбы ці вішні, паставіць букецікі першацветаў. Вымыцца трэба і самім, інакш, лічылася, увесь год пройдзе ў брудзе ды сварках.

Некалі ў чысты чацвер першы раз пастрыгалі маленькіх дзетак. Не лішне было, каб палепшыць здароўе, выстрыгчы асобныя пасмачкі і ў старэйшых сямейнікаў.

Ахоўную сілу нашы продкі надавалі і солі. Для гэтага вечарам серады яе насыпалі ў сподачкі і да заходу сонца ставілі на вуліцы або на балконе. Назаўтра раніцай яе ўносілі ў дом і захоўвалі як абярэг.

У чысты чацвер фарбавалі яйкі. У нас казалі, што яны, знесеныя курамі ў гэты дзень і з'едзеныя на свята, будуць засцерагаць ад хвароб, што іх шалупайкі (змолатыя ў парашок або стоўчаныя) можна пакрысе дадаваць у ежу цяжарным жанчынам альбо настоем адпойваць хворых людзей і жывёлу.

Нават памерлым, лічылася, можна паспрыяць з дапамогай велікодных яек! Каб зрабіць гэта, іх на Радаўніцу трэба пакласці на магілы: для птушак, якія потым папросяць у Бога даравання грахоў.

А яшчэ людзі кажуць, што той, хто памрэ на Вялікдзень ці ў час усяго Велікоднага тыдня, трапіць у рай, бо дзверы ў пекла на гэты час зачыняюцца.

У свята — і абавязкова — трэба радавацца і частаваць кожнага чалавека, які зойдзе ў хату, бо існуе павер'е, што за добрыя ўчынкі ў гэтыя дні Гасподзь даруе грахі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Апроч таго, прыкмячалі, што калі на першы дзень Вялікадня мароз альбо гром, то год будзе ўраджайным і якое надвор'е на Вялікдзень, такое — на ўсю вясну.

**Соф'я Кабарыха,**
*в. Паланечка, Баранавіцкі раён*

■

■ Як ёсць, так ёсць

# МАЯ БЕДНАЯ РОДНАЯ ШКОЛА...

**Тыдняў колькі таму адміністрацыя нашай Мілашоўскай базавай школы-садка запрасіла бацькоў на сход, каб абмеркаваць там адно, але вельмі балючае пытанне — аб... ліквідацыі гэтай установы.**

Паводле слоў намесніка старшыні райвыканкама, начальніка райаддзела адукацыі, фінансавыя затраты на ўтрыманне школы, якую наведваюць толькі 49 вучняў і 15 выхаванцаў садка, для бюджэту, на жаль, становяцца непад'ёмнымі. Танней атрымліваецца прыбдаць дадатковы аўтобус (адзін ужо ёсць, і возіць ён вучняў з закрытай Перабродскай школы). А нашы дзеці будуць наведваць Павяцкую сярэднюю. І ў яе ж (альбо ў школы райцэнтра) абяцаюць працаўладкаваць настаўнікаў...

Усё як быццам падлічана і прадумана, час на вырашэнне іншых арганізацыйных пытанняў, звязаных з закрыццём школы, да першага верасня ёсць. Але ж людзі ўсё роўна, мякка кажучы, занепакоены: перажываюць за дзяцей (найперш — малых, выхаванцаў садка), для якіх штодзённыя аўтобусныя пераезды стануць дадатковай фізічнай і псіхалагічнай нагрузкай, перажываюць за сваю школу яшчэ і таму, што яна, наша Мілашоўская, адна з найстарэйшых у раёне. Аб яе адкрыцці сведчаць дакументы з архіва, радкі з «Памятных кніжак Віленскай губерні».

Уражваюць і адначасова здзіўляюць такія лічбы: у 1886 г. у школе (тады яна называлася народным вучылішчам) налічвалася ўсяго 16 вучняў (хлопчыкаў). І сродкі для іх навучання, для аплаты працы настаўніка і святара былі.

Школа працягвала працаваць і «за панскай Польшчай» у 1921—1939 гадах, і за «тымі», як у нас казалі, саветамі ў 1939—1941 гадах... Нават у гады вайны і ў ліхія пасляваенныя, нягледзячы ні на што, дзеці там вучыліся...

Для мяне асабіста гісторыя школы — гэта яшчэ і гісторыя сям'і. Мой дзед і мой бацька (дарэчы, яго аднакласнікам быў генерал-лейтэнант Санкоўскі, імем якога названа адна з вуліц у Баранавічах) выпускнікі нашага народнага вучылішча. У розныя часы, але менавіта тут вучыліся ўсе пяць маіх сясцёр і брат.

Я заканчваў Мілашоўскую ўжо сямігодку ў 1959-м, а з 1967-га і да выхаду на пенсію працаваў там настаўнікам фізкультуры, гісторыі і музыкі.

...Шкада школу. І не толькі яе. Не мной заўважана — гэта як правіла: пасля ліквідацыі сельскіх школ заміраe жыццё ў саміх вёсках. Але ж у нас — *аграгарадок* Ідолта, толькі за апошнія гады тут пабудавана каля 40 так званых прэзідэнцкіх дамоў. І што будзе далей?

**Альфрэд Тычко,** *в. Ідолта, Мёрскі раён*

■

■ Чалавек — чалавеку

# НА МЯЖЫ

...Міхась ажаніўся па залёце: дзяўчына, з якой сустракаўся, прыехаўшы на канікулы, «ні з таго ні з сяго» ўзяла і зацяжарыла. Здавалася б, не бяда, бо з суседняй вёскі, прыгожая, разумная, працавітая, без памяці закаханая...

Гэта цешыла самалюбства жаніха. Ды і дзяўчына яму падабалася. Але ж — не больш таго: нейкіх сур'ёзных намераў ён пакуль што не меў, не планаваў абзаводзіцца сям'ёй. У яго заставаўся яшчэ год вучобы, потым хацелася ўладкавацца на прэстыжную працу ды, як кажуць, абжыцца-агледзецца, стаць на ногі, і — пагуляць... Дзяўчат у яго нямала было, але ж ранейшыя адносіны не напружвалі, ні да чога не абавязвалі. А вось тут... Уліп, што называецца.

Пра аборт (такое выйсце бачыў найперш) дзеўка і слухаць не хацела.

Махнуць рукой на дурную ды ўпартую і з'ехаць (няхай выкручваецца як хоча)?

Але... Вёска бачыла іх «раман» і цяпер, вядома ж, асудзіць — яго легкадумнасць, яго безадказнасць (у той час людское асуджэнне яшчэ нешта значыла)...

Хоць-нехаць прыйшлося хлопцу жаніцца, рэгістраваць адносіны.

Гэту змушанасць, гэты халадок з боку жаніха нявеста, вядома ж, адчувала, але верыла, што полымем свайго кахання ўсё растопіць.

Яна і сапраўды стала добрай жонкай і проста ўзорнай маці! За першым сынам — і ў хуткім часе — у іх нарадзіўся другі. Карацей, для шчасця было ўсё: дзеці, кватэра, праца, дастатак, — але яго, таго самага шчасця, чамусьці не было. Міхась, як здавалася, не мог дараваць сваёй жонцы змушаную жаніцьбу, а таму не даражыў ні жонкай, ні сям'ёй, час ад часу заводзіў розныя інтрыжкі. «Дабрадзеі» тут жа называлі Ірыне, слалі карткі-пісьмы — адкрывалі вочы.

Жонка гэтым чуткам-сігналам і верыла, і не верыла, цярпела — насіла боль у сабе, бо дзеці. А да таго ж яна па-ранейшаму кахала.

Так прайшлі гады. Выраслі іх сыны, раз'ехаліся па далёкіх гарадах, абзавяліся сваімі сем'ямі. Астыў і казаноўскі нораў Міхася. Такім чынам, Ірына хоць і няхутка, ды змагла парадавацца, што захавала сваю сям'ю, што ў яе ўнукаў ёсць цудоўны дзядуля, а ў сыноў — бацька, што старасць яны сустрэнуць разам...

Гром грымнуў адкуль не чакала: у яе выявілі злаякасную пухліну і...

Каго — хворую ці мужа — гэта вестка падкасіла больш, сказаць сёння цяжка, бо толькі цяпер, калі Ірына аказалася на мяжы паміж смерцю і жыццём, Міхась зразумеў, наколькі жонка яму дарагая. Ён вінаваціў сябе, што не даражыў ёй, не шкадаваў, каяўся і з усіх сіл стараўся загладзіць сваю віну.

— Ах, Міша, Міша, як жа позна ты палюбіў мяне! Як шкода часу... Тваё каханне я хіба на той свет забяру, — сумна жартавала жонка.

...Усявышні зглітаваўся над імі. Аперацыя прайшла паспяхова. Ірына атрымала шанц на далейшае жыццё, і муж цяпер пылінкі з яе здзімае: сам пыніць дом і гаспадарку, пільна сочыць за тым, каб жонка выконвала ўсе медыцынскія назначэнні. Ды што там, ён, перакананы атэіст, нават у царкву дарогу спазнаў і цяпер кожную службу ставіць свечкі за здароўе каханай жанчыны, моліцца за яе, спадзяецца, што Бог яго чуе.

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы*

■

■ Пасля пісьма

# «І БЕЗ ГРОШАЙ БЯДА, І З... ГРАШЫМА?»

**Пад такім загалоўкам у нумары «Звязды» за 1 сакавіка гэтага года быў надрукаваны ліст з вёскі Зарэчка Петрыкаўскага раёна. У ім Сяргей Іванавіч Кароткі, інвалід 1-й групы з дзяцінства, расказваў пра свае беспаспяховыя, на жаль (з-за галалёду і адсутнасці даверанасці ад сацыяльнага работніка), спробы атрымаць працэнты па ўкладзе ў ашчадным банку г.п. Капаткевічы.**

Як паведаміў у адказ на публікацыю **начальнік філіяла, Гомельскага абласнога ўпраўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» Аляксандр Іванавіч АРХІПЕНКА**, у адпаведнасці з часткай 2 артыкула 19 Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь банкі самастойна ў сваёй дзейнасці.

Што датычыцца арганізацыі касавай работы ў ААТ «АБ Беларусбанк», то яна рэгламентуецца пастановай праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 21.12.2006 г. № 211 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі па арганізацыі касавай работы ў банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацыях Рэспублікі Беларусь», Інструкцыяй па арганізацыі касавай работы ва ўстановах ААТ «АБ Беларусбанк» ад 14.04.2015 г. № 37.7. «Згодна з названымі нарматыўнымі дакументамі для ажыццяўлення касавага абслугоўвання кліентаў банка, а таксама выканання аперацый з грашовай наяўнасцю і іншымі каштоўнасцямі ствараюцца касавыя вузлы, прылады і абсталяванне якіх павінны адпавядаць прад'яўленым патрабаванням і гарантаваць нармальныя ўмовы для работы персаналу і абслугоўвання кліентаў, а таксама захаванасць каштоўнасцяў, дакументаў і бяспеку работнікаў.

Касавым работнікам забараняецца перадаваць выкананне даручанай работы з каштоўнасцямі іншым асобам, а таксама выконваць работу, якая не ўваходзіць у іх службовыя абавязкі, выконваць даручэнні кліентаў установ банка на атрыманне або ўнясенне наяўных (безнаяўных) грошай на іх рахункі без іх непасрэднай прысутнасці.

Згодна з пунктам 11.1 Інструкцыі аб парадку здзяйснення аперацый па рахунках фізічных асоб у ААТ «АБ Беларусбанк» ад 16.11.2016 г. № 129.5 расходныя аперацыі па рахунках здзяйсняюцца ўладальнікам рахунку (яго прадстаўніком) пры прад'яўленні работніку банка дакумента, які сведчыць асобу. Прадстаўнік уладальніка рахунку дадаткова прад'яўляе аформлены ва ўстаноўленым парадку дакумент, які пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка (за выключэннем даверанасці, аформленай у банку). Уладальнік рахунку можа аформіць даверанасць як у падраздзяленні банка па месцы вядзення асабовага рахунку, так і па-за яго межамі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У ходзе правядзення разбору па фактах, выкладзеных у артыкуле Кароткага С.І. «І без грошай бяда, і з... грашыма?», парушэнняў парадку здзяйснення аперацый па рахунках фізічных асоб з боку работнікаў банка не выяўлена, патрабаванні лакальных нарматыўных прававых актаў банкам выкананы.

Аддзяленне № 320/76 ААТ «АБ Беларусбанк» у г.п. Капаткевічы размешчана ў памяшканні, уласнікам якога з'яўляецца Капаткевіцкі сельскі Савет. У тым жа будынку знаходзяцца апорны пункт аховы правапарадку Петрыкаўскага РАУС, Капаткевіцкі тэхналагічны пункт РУП «Гомельское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры», аддзяленне паштовай сувязі РУП «Белпошта».

На адрас Капаткевіцкага сельскага Савета банкам накіраваны ліст, што ён гатовы прыняць долевы ўдзел у стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб».

*Гэты, апошні абзац адказу і аўтара ліста ў газету, і іншых людзей з інваліднасцю, якія жывуць у Капаткевічах ды ваколіцах, зацікавіць, відаць, найбольш, бо ім застаецца толькі паспадзявацца, што ідэю стварэння безбар'ернага асяроддзя на месцы падтрымаюць усе. І ў хуткім часе*

■


ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОАО «НОВОЕ СТЕКЛО»

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и место нахождения, контактный телефон покупателя акций** | Открытое акционерное общество «Новое стекло» 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1317, телефон +375 29 610-02-58 |
| **Полное наименование, место нахождения профессионального участника рынка ценных бумаг, регистрирующего сделки купли-продажи** | ОАО «Белинвестбанк» 220002, пр-т Машерова, 29, ком. 706, телефон 239-01-86 |
| **Полное наименование и место нахождение эмитента, акции которого покупаются** | Открытое акционерное общество «Новое стекло» 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1317, телефон +375 29 610-02-58 |
| **Цель приобретения акций** | Сокращение их количества с последующим аннулированием |
| **Количество акций, которое намеревается приобрести Покупатель** | 318 (триста восемнадцать) простых (обыкновенных) акций |
| **Цена приобретения акций, установленная общим собранием акционеров** | 94,34 (девяносто четыре рубля 34 копейки) за одну простую (обыкновенную) акцию |
| **Сроки, форма и порядок оплаты акций** | Оплата производится в течение 30 (тридцати) банковских дней с момента регистрации договоров купли-продажи у профессионального участника рынка ценных бумаг путем перечисления денежных средств на лицевые или карт-счета акционеров |
| **Место заключения договоров купли-продажи акций** | ОАО «Белинвестбанк», 220002, пр-т Машерова, 29, ком. 706, телефон 239-01-86. Сделки по приобретению акций будут осуществляться на внебиржевом рынке путем заключения договоров купли-продажи акций и регистрации их у профессионального участника рынка ценных бумаг |
| **Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций** | С 17 марта 2017 года по 16 апреля 2017 года |
| **Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи)** | С 17 апреля 2017 года по 17 мая 2017 года |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | Бобруйский филиал ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97, офис 205 |
| **Продавец** | ОАО «ФанДОК», г. Бобруйск, ул. Ленина, 95 |

**Предмет аукциона**

**Оборудование, расположенное по адресу**:
Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Ленина, 95

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. без учета НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | 3-686 | Сушилка роликовая СУР 4-1, 1989 г.в. | 67 000,00 |
| 2 | 3-658 | Сушилка роликовая СУР 4-1, 1989 г.в. | 67 000,00 |
| 3 | 3-522 | Станок шлифовальный «RAUMA-REPOLA», 1985 г.в. | 71 000,00 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) календарных дней после проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **10.05.2017** в 11.00 по адресу: **г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97, пом. 205, ЗАО «Центр промышленной оценки** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **05.05.2017** до 17.00 по адресу: **г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97, пом. 205, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 225-72-00-38; +375 29-662-86-96. E-mail: auction@cpo.by** |